***А. В. Жураў,*** *дац., праф. каф. харавога*
*і вакальнага мастацтва*

# ПЕРШЫЯ ГАСТРОЛІ БЕЛАРУСКАГА АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ТАНЦА ПАД МАСТАЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ Р. Р. ШЫРМЫ ПА ГАРАДАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РАСІІ Ў ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Выдатны дзеяч беларускай культуры, харавы дырыжор, этнограф-фалькларыст Рыгор Раманавіч Шырма казаў, што песня – гэта душа народа, яго жывая гісторыя, і імкнуўся праз беларускую народную песню абуджаць у народзе пачуцці гонару і захаплення роднай творчасцю.

Першага лістапада 1939 г. Р. Р. Шырме быў уручаны мандат на арганізацыю Беларускага ансамбля песні і танца, першага прафесійнага калектыву ў яго жыцці. Створаны калектыў у колькасці 60 чалавек пачаў сваю працу ў г. Беластоку 15 студзеня 1940 г.

У хоры працавала шмат выкладчыкаў спеваў, якія вучыліся ва ўніверсітэтах Варшавы, Вільнюса, і моладзі з самадзейных калектываў. Працоўны дзень іншы раз працягваўся больш за 7 гадзін, гэта толькі спеваў. А вечарамі Рыгор Раманавіч прыходзіў са сваёй неразлучнай скрыпачкай ў інтэрнат, дзе жылі артысты, і займаўся шмат гадзін то з жаночай, то з мужчынскай групамі. Ён добра граў на скрыпцы і заўсёды карыстаўся ёю на рэпетыцыях. Па свайму гучанню скрыпка нагадвае чалавечы голас, асабліва сапрана, і таму на рэпетыцыях пад яе гук было вельмі добра выраўніваць строй галасоў артыстаў. Артысты гуртам хадзілі на рэпетыцыі за сем кіламетраў. Усім хацелася як мага хутчэй выступіць на прафесійнай сцэне, – успамінаў заслужаны артыст БССР Міхась Шуманскі.

23 лютага 1940 г. у Беластоку ў Доме афіцэраў адбыўся першы канцэрт Беларускага ансамбля песні і танца (які ў той час называўся Беластоцкім). У праграму ўвайшлі папулярныя ў той час творы: «Песня о Сталине» А. Аляксандрава, «Нарач» і «Ой, загуду» М. Гайваронскага, «Соловушка» і «Ночевала тучка» П. Чайкоўскага, «Серадзская свадьба» К. Проснака, «Молодежная» І. Дунаеўскага і іншыя, а таксама танцы, якія былі пастаўлены балетмайстрам І. М. Хворастам, – «Лявоніха», «Крыжачок», «Лянок», «Таўкачыкі», «Мяцеліца» і інш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З першых дзён працы калектыву Рыгор Раманавіч значнае месца адводзіў выхаванню ў маладых артыстаў працоўнай і творчай дысцыпліны. Ён лічыў, што чалавек павінен праяўляць арганізаванасць, любоў да працы, да Радзімы. У вольны ад працы час Рыгор Раманавіч запрашаў да сябе артыстаў, праводзіў з імі вечары-чытанні, знаёміў з творчасццю Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Пушкіна і іншых класікаў літаратуры, рабіў праслухоўванне пласцінак з запісамі Ф. Шаляпіна і Забэйды-Суміцкага, які выконваў беларускія народныя песні.

Пасля выступленняў у гарадах Заходняй Беларусі, а таксама шэрагу канцэртаў у Мінску, у прадстаўнікоў улады і знаўцаў харавога і музычнага мастацтва склалася аб калектыве нядрэннае ўражанне.

15 мая 1941 г., пасля грунтоўнай падрыхтоўкі праграмы канцэртаў, Беларускі ансамбаль песні і танца, узначалены Рыгорам Раманавічам, выехаў у Маскву на гастролі. Важнымі і адказнымі былі для маладога калектыву першыя канцэрты ў сталіцы нашай вялікай Радзімы, Маскве. Сваімі выступленнямі перад працоўнымі Масквы, Каўрова, Калініна, Арджанікідзэ, Бранска, Іванава і іншых гарадоў хор і танцавальная група прадэманстравалі высокую выканальніцкую культуру. Натхнёна перадаваў хор самабытнасць і прыгажосць беларускай народнай песні, яе чысціню і свежасць.

Выступаў ансамбль у Цэнтральным доме работнікаў мастацтваў, у Канцэртнай зале імя П. І. Чайкоўскага, на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставе, у парку Горкага, на Усесаюзным радыё, дзе былі зроблены гуказапісы.

Сустрэўся калектыў з артыстамі Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага хору імя М. Я. Пятніцкага, а таксама Двойчы чырвонасцяжнага акадэмічнага ансамбля песні і пляскі Расійскай арміі імя А. В. Аляксандрава. У Цэнтральным доме работнікаў мастацваў артыстаў ансамбля горача вітаў Ігар Маісееў, якога вельмі зацікавіў беларускі народны танец.

Пасля выступленняў у Маскве калектыву было дадзена зялёнае святло для гастроляў па гарадах РСФСР.

Вайна застала Беларускі ансамбаль песні і танца ў г. Арле. Пасля некалькіх канцэртаў на мабілізацыйных пунктах па даносу, ці па прычыне прыкрай памылкі мясцовых улад, Рыгора Раманавіча абвінавацілі ў нацыяналізме, як потым высветлілася, у сувязі з вялікай колькасцю ў праграме беларускіх народных песень і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танцаў, і 22 чэрвеня арыштавалі і адвезлі на Лубянку. Над ансамблем павісла пагроза расфарміравання.

23 чэрвеня, на другі дзень вайны, ансамбль адправілі ў Маскву для вырашэння лёсу калектыву і яго кіраўніка. Пачаліся допыты, удакладненні, выклікі ў следчыя органы. У разгляд справы ўключыўся першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцелеймон Панамарэнка. У выніку Крэмль вырашыў захаваць калектыў, але пастанавіў поўнасцю замяніць рэпертуар новымі сучаснымі харавымі творамі і танцамі. Р. Шырму вызвалілі з-пад варты. Пачалася адказная цяжкая праца над новай канцэртнай праграмай. Днямі і начамі ішлі рэпетыцыі. 29 чэрвеня 1941 г. адбыўся строгі прагляд новай канцэртнай праграмы камісіяй НКУС. Пасля канцэрта артысты ансамбля і Рыгор Раманавіч, ні жывыя ні мёртвыя, чакалі прысуду… І вось, радасць! Праграму прынялі і ўхвалілі. Адразу ж, на наступны дзень, 30 чэрвеня, калектыў быў накіраваны на абслугоўванне мабілізацыйных пунктаў Масквы, наваколля і вайсковых частак, якія прыбывалі ў Маскву.

Рыгор Раманавіч пастаянна трымаў сувязь з кампазітарамі І. Дунаеўскім, А. Новікавым, М. Блантэрам і іншымі і тэрмінова дапаўняў рэпертуар іх новымі харавымі творамі на ваенную тэматыку.

Рашэннем партыі і ўрада 16 ліпеня 1941 г. ансамбль разам з многімі іншымі творчымі калектывамі Масквы быў эвакуіраваны ў Краснаярск. І ўжо 20 ліпеня 1941г. у Клубе чыгуначнікаў адбыўся канцэрт для байцоў Чырвонай арміі. І зноў, цэлымі днямі пачалася карпатлівая работа над новай праграмай, якая б адпавядала тэме дня. У яе увайшоў і тэатралізаваны мантаж на тэксты паэтаў В. Раждзественскага і К. Лісоўскага, рэжысёрам якога быў А. Данілевіч. Калі работа была поўнасцю завершана і прынята камісіяй, ансамблю выдзелілі два маленькія таварныя вагончыкі, у якіх яны жылі ў перыяд гастроляў па гарадах Канск, Тайшэт, Чыта, Іркуцк і інш. 6 кастрычніка 1941 г. ансамбль накіроўваюць у Сярэднюю Азію. Там ён выступае больш чым у 30 гарадах, сярод якіх Сяміпалацінск, Чарск, Жарма, Аягуз, Матай, Уш-Тобе, Алма-Ата, Фрунзэ, Чыкмент, Арысь, Ташкент, і дае звыш 218 канцэртаў.

У Ташкенце ў гарадскім парку, калі закончылася выступленне, на сцэну да артыстаў выйшаў Якуб Колас. Ён падзякаваў сваіх землякоў-артыстаў за цудоўныя песні, якія яны так шчыра, ад душы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праспявалі. Гаварыў аб тым, што, слухаючы іх, як бы пабываў на сваёй Радзіме і спадзяецца на хуткую сустрэчу ў Беларусі.

30 верасня 1942 г. у Навасібірску адбылася сустрэча калектыву і з прадстаўнікамі беларускіх партызан. На канцэрце ў зале філармоніі партызаны падарылі калектыву акардэон, які яны, як трафей, забралі ў фашыстаў пасля паспяховага бою ў адной з мясцін на Заходняй Дзвіне ў раёне Суража.

16 чэрвеня 1943 г. ансамбль пераехаў у г. Данілаў Яраслаўскай вобласці, адкуль вёў актыўную канцэртную дзейнасць не толькі ў прылягаючых сёлах і райцэнтрах, але і ў парках культуры і адпачынку, у ваенных акадэміях імя М. Я. Жукоўскага, У. І. Леніна, М. В. Фрунзэ, а таксама на заводах, фабрыках, у вайсковых часцях, лепшых канцэртных залах краіны. У гэты перыяд хору была прадастаўлена магчымасць зрабіць фондавы запіс на магнітную стужку. За ўвесь час знаходжання ў г. Данілаў ансамбль даў звыш 30 канцэртаў.

Праз нейкі час калектыў быў адкліканы ў Маскву і 18 снежня 1943 г. накіраваны ў вызвалены Гомель. Там ансамбль працаваў і даваў канцэрты ў клубе Нова-Беліцкай запалкавай фабрыкі. Слухачамі з’яўляліся партызаны, савецкія байцы, працоўныя прамысловых прадпрыемстваў Гомеля і вызваленых ад ворага раёнаў Беларусі. За час базіравання ў Нова-Беліцы (з 1 студзеня 1943 г. па 9 чэрвеня 1944 г.) было дадзена 120 канцэртаў.

Нашы войскі паспяхова вызвалялі горад за горадам. Калі быў вызвалены Мінск, ансамблю выпала ганаровая місія выступаць на парадзе партызан, які адбыўся 14 ліпеня 1944 г. на іпадроме беларускай сталіцы. Больш за 40 тыс. партызан прайшлі строем перад трыбунай, на якой знаходзіліся і артысты Беларускага ансамбля песні і танца.

Калектыў даваў канцэрты амаль штодзённа, абслугоўваючы вайсковыя часці, шпіталі, жыхароў Мінска.

У гэты час Р. Шырма наладжвае сувязі з беларускімі кампазітарамі, папаўняе рэпертуар новымі творамі і ўкамплектоўвае харавую групу ансамбля таленавітымі спевакамі.

7 кастрычніка 1944 г. Беларускі ансамбль песні і танца накіроўваецца на новае месца працы і жыцця – у г. Гродна – і адтуль вядзе гастрольную дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Дзень Перамогі, самы радасны дзень для савецкага народа, ансамбль выступае ў Гродна перад грамадскасцю горада, байцамі і афіцэрамі Савецкай арміі, партызанамі.
Усяго за перыяд Вялікай Айчыннай вайны Беларускім ансамблем песні і танца было дадзена каля 800 канцэртаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ